# Шлях да спасціжэння нязведанага



**На базе Гомельскай бібліятэкі-філіяла № 4 прайшло цікавае мерапрыемства пад назвай "Бібліятэчны выпускны". Яно завяршыла плённую двухгадавую работу. Кіравала падрыхтоўкай і правядзеннем мерапрыемства загадчык бібліятэкі Л.А.Капусціна. Яго ўдзельнікі — вучні 2—5 класаў сярэдняй школы № 45 Гомеля.**



Два гады запар школа і бібліятэкі-філіялы №№ 4 і 15 цесна супрацоўнічалі, ператваралі ў жыццё ідэі інавацыйнага праекта "Укараненне кампетэнтнасна-арыентаванай мадэлі фарміравання інфармацыйнай культуры вучняў ва ўмовах інтэграванага ўзаемадзеяння школы і гарадской бібліятэкі". І гэтая работа прынесла адпаведныя вынікі. Вучні ўсвядомілі, што фарміраванне інфармацыйнай культуры закладвае асновы светапогляду, далучае да духоўных, культурных традыцый беларускага народа.

Кіравалі інавацыйнай дзейнасцю дырэктар школы К.С.Кіржанаў і намеснік дырэктара по вучэбнай рабоце М.С.Парахаўнік. Адукацыйны працэс у класах у рамках работы над праектам ажыццяўлялі вопытныя педагогі: Г.Ф.Сярэдзіч, А.У.Бужан, Л.У.Рабая, В.М.Пінчук, Л.А.Пінчукова, В.М.Кукса.

Дзеці вучыліся правільна, асэнсавана чытаць вучэбны тэкст, ставіць да яго пытанні, знаходзіць інфармацыю па заданні са СМІ, знаёміліся з новымі словамі, працавалі з даведачнай літаратурай, слоўнікамі. Вучні з задавальненнем наведвалі мерапрыемствы, падрыхтаваныя работнікамі дзіцячых бібліятэк-філіялаў, удзельнічалі ў віктарынах, відэапаказах, конкурсах, рыхтавалі святочныя мерапрыемствы для гасцей бібліятэкі, вучыліся знаходзіць па каталогах неабходную літаратуру, адбіраць інфармацыю.

Пазнавальнымі, цікавымі былі мерапрыемствы "У краіне Мультландыі", гульня-віктарына да 115-годдзя У.Дыснея "Пасвячэнне ва Уолцікі", web-падарожжа па дзіцячых прававых сайтах да Сусветнага дня дзяцей "Ты маеш права".

**Марыя ПАРАХАЎНІК,**
**намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 45 Гомеля.**